і бібліяграфія (па напрамках) / Н. А. Ляйко, А. І. Фядорына. – Мінск : БДУКМ, 2013. – 108, [1] с.
4. *Ляйко, Н. А.* Каталагізацыя дакументаў. Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне : вучэб. дапам. для студэнтаў спецыяльнасці «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія» / Н. А. Ляйко, А. І. Фядорына. – 2-е выд., стэр. – Мінск : [б. в.], 2007. – 178, [1] с.
5. *Ляйко, Н. А.* Каталагізацыя дакументаў : вучэб.-метад. комплекс / Н. А. Ляйко, А. І. Фядорына ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2020. – 278 с.
6. *Ляйко, Н. А.* Каталагізацыя дакументаў. Індэксаванне дакументаў : вучэб. дапам. для студэнтаў спецыяльнасці «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія» вышэйшых навучальных устаноў / Н. А. Ляйко, А. І. Фядорына. – 2-е выд., са змяненнямі. – Мінск : [б. в.], 2011. – 113, [1] с.
7. СТБ 7.1-2024 Библиографическая запись. Библиографическое описание. Общие требования и правила составления = Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне. Агульныя патрабаванні і правілы складання. – Дата введения 2024-10-01. – Минск : Госстандарт, 2024. – 60 с.
8. *Сукиасян, Э. Р.* «Штучный товар». О подготовке специалистов в области современной каталогизации / Э. Р. Сукиасян // Науч. и техн. б-ки. – 2017. – № 7. – С. 55–61.
9. *Тараненко, Л. Г.* Подготовка каталогизаторов в Кемеровском государственном институте культуры [Электронный ресурс] / Л. Г. Тараненко, О. Я. Сакова // Библиосфера. – 2019. – № 4. – С. 103–111. – Режим доступа: https://doi.org/10.20913/1815-3186-2019-4-103-111https://doi.org/ 10.20913/1815-3186-2019-4-103-111. – Дата доступа: 05.09.2024.

УДК 398.332.416:316.334.52(476.7)

**І. В. Хамутова,**
*аспірант установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», Мінск, Беларусь*

## МЕТАДЫ ЗБІРАННЯ І АПРАЦОЎКІ ТРАДЫЦЫЙНАЙ КАЛЯДНАЙ АБРАДНАСЦІ

**Анатацыя.** Вызначаюцца асноўныя метады збірання і апрацоўкі сабраных матэрыялаў каляднай абраднасці беларусаў. Разгледжаны такі метад збіральніцкай працы, як метад непасрэднага назірання, які выкарыстоўваецца ва ўсіх антрапалагічных навуках, у тым ліку культурнай антрапалогіі і этнаграфіі. Для апрацоўкі і сістэматызацыі запісаў у фальклорныя адзінкі ўжываецца індуктыўны метад, а для вывучэння сабраных матэрыялаў – аўдыявізуальны і фотаэлікацыя.

**Ключавыя словы:** Заходняе Палессе, калядная абраднасць, метад непасрэднага назірання, аўдыявізуальны метад, фотаэлікацыя.

**I. Homutova,**
*Postgraduate student of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts", Minsk, Belarus*

## METHODS OF COLLECTING AND PROCESSING OF TRADITIONAL CAROLING RITUALISM

**Abstract.** The article is aimed to determine the main methods of collection and processing of collected materials of caroling ritualism of Belarusians. To achieve this goal, the following method of collective work has been considered – a direct observation method, which is used in all anthropological sciences, including cultural anthropology and ethnography. There is an inductive method for processing and systematizing records in folklore units, and audiovisual and photoelimination for studying the collected materials.
**Keywords:** the West Polesie, caroling ritualism, direct observation method, audiovisual method, photoelimination.

У артыкуле зроблена спроба вызначэння асноўных метадаў збірання і апрацоўкі сабраных матэрыялаў каляднай абраднасці беларусаў.

Неад'емнай задачай навукі аб народах з'яўляецца пастаяннае папаўненне фактаграфічных даных і глыбіня тэарэтычнага асэнсавання і абагульнення, якая несумненна залежыць ад дакладнасці і дэталёвасці фактаграфічнага матэрыялу. Р. М. Кавалёва ў дачыненні да носьбітаў традыцыі адзначае, што нашы папярэднікі былі адукаванымі людзьмі, шчыра захопленымі прыгажосцю традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў, таленавітымі «метадыстамі-выкладчыкамі» [1, с. 5], якія заклалі падмурак для тэарэтычных і практычных пошукаў, акрэслілі шляхі і вектары навуковых даследаванняў.

Асаблівасцю антрапалагічных навук, у тым ліку і культурнай антрапалогіі, з'яўляецца метад непасрэднага назірання, які выкарыстоўваецца для збору матэрыялаў. Ён патрабуе, каб даследчык жыў сярод людзей, якіх вывучае [2, с. 25]. Асноўная мэта палявой працы, па меркаванні Б. Маліноўскага, «улавіць пункт гледжання мясцовага жыхара, усвядоміць яго бачанне свету» [7]. Гэтыя словы да нашага часу застаюцца грунтоўнымі для культурнай антрапалогіі.

З цягам гадоў дадзены метад не губляе актуальнасці і выкарыстоўваецца даследчыкамі традыцыйных абрадаў.

Пры падрыхтоўцы апытальніка для правядзення інтэрв'юіравання носьбітаў традыцыі і ўдзельнікаў калядавання выкарыстоўваюцца прынцыпы, прадстаўленыя С. Квале ў грунтоўнай працы «Исследовательское интервью» [4]. Так, важна, што аўтар лічыць любога чалавека носьбітам цэлага сусвету, мікракосма. Гэта дае нам магчымасць праз размову з адзінкавымі ўдзельнікамі абрадаў і раскрыццё іх мікракосма скласці агульнае ўяўленне аб лакальным мясцовым светаўспрыманні рэчаіснасці падчас правядзення каляднага абраду. Таксама метадалагічныя рэкамендацыі да апытальнікаў па каляднай абраднасці

прадстаўлены В. І. Басько, Т. І. Кухаронак [3, с. 27–31] і І. В. Мазюк [Там жа, с. 221–223].

Асобна трэба вылучыць сучасны метад даследавання – аўдыявізуальны, пры дапамозе якога могуць быць выкарыстаны ранейшыя матэрыялы па візуальнай антрапалогіі. Звяртаючыся да папярэднікаў, узгадаем этнаграфічны фільм «Палескія калядкі» («Беларусьфільм», творчае аб'яднанне «Летапіс», 1972 г.), над якім працавала З. Я. Мажэйка. У фільме адлюстраваны як заходнепалескія калядныя абрады, так і ўсходнепалескія. Разглядаючы менавіта калядныя абрады Брэсцкай вобласці, трэба адзначаць, што ў этнаграфічным фільме зафіксаваны калядкі Пінскага раёна – в. Клятная, Іванаўскага раёна – в. Моталь і аг. Тышкавічы. Дадзены фільм каштоўны тым, што праз яго фалькларысты, этнографы, культуролагі, этнамузыколагі маюць магчымасць пачуць аўтэнтычныя спевы з захаваннем мясцовых асаблівасцей выканання, дыялектныя асаблівасці і пабачыць уласцівыя адметнасці каляднай абраднасці, якая захавалася ў XX ст. у бытаванні.

Каляндарна-абрадавы фальклор найбольш устойлівы і нязменны, але з цягам часу, тым не менш, перажывае трансфармацыю. У сувязі з гэтым, узрастае актуальнасць выкарыстання аўдыявізуальнай фалькларыстыкі.

Сучасны стан каляднай абраднасці Заходняга Палесся прадстаўлены ў матэрыялах Белтэлерадыёкампаніі з серыі «Жывая спадчына», дзе зафіксаваны сучасны стан і гісторыя абраду шчадравання вёсак Рог і Восава Салігорскага раёна і г. Давыд-Гарадок Столінскага раёна.

Для апрацоўкі эмпірычных даных у культурнай антрапалогіі выкарыстоўваецца індуктыўны метад. У артыкуле паняцце індукцыі будзе вызначацца па С. А. Лебедзеву, як «абагульненні на аснове досведу» [5, с. 6].

Яшчэ адным з метадаў візуальнай антрапалогіі з'яўляецца фотаэлікацыя [6]. Дадзены метад дазваляе пры дапамозе ілюстрацыйных матэрыялаў, а менавіта фотаздымкаў, рэканструяваць вонкавы выгляд калядоўшчыкаў і ў прыватнасці калядных атрыбутаў.

Напрыканцы трэба адзначыць, што даследаванні традыцыйнага абраду калядавання пабудаваны на грунтоўным метадалагічным падмурку збіральніцкай працы культурнага антраполага пры дапамозе метаду непасрэднага назірання і індуктыўнага метаду апрацоўкі эмпірычных даных і стварэння фальклорных адзінак, а таксама даследаванняў сабраных раней матэрыялаў пры дапамозе аўдыявізуальнага метаду і фотаэлікацыі.

*1.* Вулей і пчолы: вектары сучаснай фалькларыстычнай школы БДУ : зб. навук. арт. / Беларус. дзярж. ун-т ; уклад. В. В. Прыемка ; пад навук. рэд. Р. М. Кавалёвай. – Мінск : Права і эканоміка, 2011. – 291 с.

2. *Дарашэвіч, Э. К.* Тэорыя фальклору : вучэб.-метад. дапам. / Э. К. Дарашэвіч. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2016. – 78 с.

3. Даследаванне лакальных культур Беларусі : праграмы па зборы фальклор.-этнагр. матэрыялаў / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : БДУКМ, 2008. – 402 с.

4. *Квале, С.* Исследовательское интервью / С. Квале. – М. : Смысл, 2003. – 301 с.

5. *Лебедев, С. А.* Методология науки: проблема индукции / С. А. Лебедев. – М. : Альфа-М, 2013. – 189 с.

6. *Хамутова, І. В.* Сродкі і метады візуальнай антрапалогіі ў даследаванні заходнепалескай каляднай абраднасці / І. В. Хамутова // Гісторыка-культурная спадчына магнацкага роду Тышкевічаў у кантэксце візуальнай культуры : IX Тышкевіцкія чытанні, Валожын, 15 верас. 2022 г. : зб. навук. арт. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2022. – С. 72–78.

7. *Христофорова, О. Б.* Полевые методы в визуальной антропологии [Электронный ресурс] / О. Б. Христофорова // Фольклор и постфольклор: структура, типология, семиотика. – Режим доступа: https://www.ruthenia.ru/folklore/hristoforova3.htm. – Дата доступа: 13.05.2022.

УДК [378.147-024.24]:020(575.1)

**И. К. Цай,**
*старший преподаватель кафедры*
*«Библиотечно-информационная деятельность»*
*Государственного института искусств и культуры Узбекистана,*
*Ташкент, Узбекистан*

# АНАЛИЗ ПРОЦЕССА ВНЕДРЕНИЯ КРЕДИТНО-МОДУЛЬНОЙ СИСТЕМЫ В ОБРАЗОВАНИЕ СТУДЕНТОВ НАПРАВЛЕНИЯ «БИБЛИОТЕЧНО-ИНФОРМАЦИОННАЯ ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ» В ГОСУДАРСТВЕННОМ ИНСТИТУТЕ ИСКУССТВ И КУЛЬТУРЫ УЗБЕКИСТАНА

**Аннотация.** Представлен анализ процесса внедрения кредитно-модульной системы в образовательную программу студентов направления «Библиотечно-информационная деятельность» в Государственном институте искусств и культуры Узбекистана. Рассмотрены основные этапы перехода на новую систему обучения, ее влияние на качество образовательного процесса, а также выявлены ключевые проблемы, с которыми сталкиваются преподаватели и студенты в ходе внедрения. Особое внимание уделяется перспективам адаптации кредитно-модульной системы в контексте специфики подготовки библиотечных кадров и необходимости реформирования высшего образования для повышения его эффективности и конкурентоспособности.

**Ключевые слова:** высшее библиотечное образование, библиотечно-информационная деятельность, кредитно-модульная система, Государственный институт искусств и культуры, преподаватель, студент, модуль, кредит.